Печали, горести не зная.
Пусть не пугают Вас года –
Ещё их сколько в жизни будет.
Пусть будут в спутниках всегда
Доброжелательные люди.
Пусть ангел Вашу жизнь хранит,
Ведь в жизни всякое бывает.
Пусть горе в двери не звонит,
А радость Вас не забывает.

С уважением учащиеся 6 группы портных ПТУ-129

Дорогая и любимая доченька, сестричка и девушка

УСОВИЧ Светлана!

Поздравляем тебя с днём рождения!

У тебя сегодня День рожденья.
Это самый радостный из дней.
Пусть вот это наше поздравленье
Тоже будет радостью твоей.
Пусть жизнь полнее станет
И с каждым днём ты будь мудрей.
Пусть долго молодость не вянет
И жизнь проходит веселей.
Пусть печали, заботы, сомненья
Не тревожат тебя никогда.
Долгой жизни счастливой желаем,
Ни на год, ни на день – навсегда.
И под звон хрустальных бокалов,
В кругу всех родных и друзей,
От чистого сердца тебе мы желаем
Добра, здоровья, светлых дней.
И чтобы беды, горе и ненастье
Все проходили стороной.
Лишь только радость, только счастье
К тебе летели в дом родной.

С любовью к тебе мама, папа, сестра Оксана и Сергей

ГРИГОРЬЯН Артур Шафагатович!

Хочу тебя поздравить я сердечно,
Тебе сегодня 45,
Ты для меня на свете лучше всех.
Пусть счастье в жизни
Длится бесконечно,
Во всём тебе сопутствует успех!
Когда я просто на тебя смотрю,
То за тебя судьбу благодарю,
Когда моя рука в твоей руке,
То всё плохое где-то вдалеке,
Когда щекой к твоей я прикоснусь,
То ничего на свете не боюсь,
Когда я глажу волосы твои,
То сердце замирает от любви,
Когда смотрю в счастливые глаза,
То на моих от нежности слеза,
С улыбкой светлой на тебя смотрю
И жизнь, что вместе мы, благодарю.

Я. Т.

СЛОНИМЧАНЕ УЧАСТВОВАЛИ В "ДНЕ БОРОДИНА"

С 1839 года на Бородинском поле проводятся военно-исторические праздники. Тогда здесь впервые прошли маневры с участием 150 тысяч войск под командованием императора Николая I. С 1962 года праздник "День Бородина" проводится ежегодно в 1-е воскресенье сентября.

За прошедшие десятилетия сложилась традиционная структура праздников: отдание почестей павшим героям двух Отечественных войн, воспроизведение эпизодов сражения 1812 года, проведение научных конференций. В этом году в торжествах, посвященных 189-й годовщине Бородинского сражения, приняло участие до 100 тысяч человек. Активными участниками фестиваля стали военно-исторические клубы более чем из 20-ти областей и республик России, Беларуси, Украины, Польши, Литвы и Франции. Делегацию Беларуси представляли работники Минского шарикоподшипникового завода, члены клуба Минского пехотного полка из Слонима, слонимские кадеты. Белорусской делегации была оказана честь стоять в Почетном карауле на торжественном церемониале у батареи Раевского.

Непосредственно в военно-исторической реконструкции боя 1812 года за Багратионовы флеши было задействовано до 800 человек пехоты, 100 кавалеристов и 14 артиллерийских орудий. Впечатление реальности происходящего на реконструкции создавали не только пиротехнические эффекты, но и слаженные действия войск "противников", до мелочей воспроизведших события 189-летней давности.

Завершилась реконструкция торжественным построением военно-исторических клубов, среди которых были названы и награждены лучшие. Но на этом программа фестиваля для делегации Беларуси не закончилась. После "сражения" удалось посетить в Москве Бородинскую панораму и Красную площадь. А на обратном пути домой сделали еще остановку в Смоленске для осмотра достопримечательностей этого славного города.

Делегация Беларуси у орудия XIX века



Под знаменем Минского пехотного полка

Валерий КОВАЛЕНКО
Фото Михаила ХАРЧЕНКО

ОПРОС

Что это – когда у вас ЧЕШЕТСЯ НОС?

Вот со стола упала вилка, чёрная кошка перебежала дорогу, или у вас зачесался нос. Кажется, знакомые суеверия? Эти приметы появились много лет назад, и поныне многие в них верят. Недавно корреспондент "Газеты Слонимскай" обратилась к слонимчанам с вопросом: "Верят ли они в приметы?" Ответы были совсем разные.

Кашуба Илья, 15 лет, школьник

— В приметы я верю, потому что они всегда сбываются. Например, когда чёрная кошка перебежит дорогу, жду неприятностей.

Авакьян Дмитрий, 15 лет, школьник

— Если что-то нехорошее со мной случится, мама комментирует, что это значит. Мама верит в это, я — нет.

Ларченко Наталья, 22 года, представитель компании "Дело" в Слониме

— В приметы я не верю, стараюсь не быть суеверной. Верю в Бога.

Иванов Михаил Николаевич, 47 лет, преподаватель физкультуры

— Я категорически не признаю суеверий. У каждого есть своя вера, я так понимаю. Я верю в человека и его способности.

Валентина Сергеевна, 45 лет, кассир

— Верю в народные приметы: так по жизни складывается. Верю также в толкование снов.

Плахтинская Нина Иосифовна, 64 года, поёт в церковном хоре

— Верю, что возвращаться назад нельзя, как убедилась. Эта примета сбывалась.

Александр, 20 лет

— Не могу сказать, что я очень суеверен. Верю в приметы, связанные с животными. Но вообще я считаю, что вера — вещь противоречивая.

Сергей, 21 год, студент

— Приметы — это всё ерунда, пережитки язычества. Но с ними веселее.

Петлицкий Иван (23 года) и Савицкий Владимир (25 лет)

— В приметы мы верим, потому что они сбываются. Вот, например, если локоть чешется, то наверняка будем спать на новом месте. Левая рука чешется — к деньгам, правая — к рукопожатию.

Александров Андрей, 19 лет, студент

— Не верю я в приметы. Единственное, что я заметил: если думаю, что на экзамене получу четвёрку, то обязательно преподаватель ставит тройку.

Петроченко Вадим, 18 лет, студент

— Единственное заметил: иду на экзамен, встречаю одного человека — получаю двойку, иду на другой экзамен, встречаю снова его — снова двойка, иду на третий экзамен, не встречаю этого человека — получаю четвёрку. Но вообще я не суеверен!

Родригес Алексей, 15 лет, школьник

— Некоторые приметы сбываются, но мне кажется, что это совпадения. Хотя убедился, что, когда ласточки низко летают — быть дождю.

Диана ДАНЧЕНКО, Ольга ШИНКЕВИЧ (фото)

ВЫВУЧАЕМ РОДНЫ КРАЙ

Некалькі гадоў запар я вандрую разам са сваімі сябрамі па Беларусі.

Сёлета мы прайшлі па Брэсцкай вобласці. Цудоўныя, прыгожыя абшары Белавежскай пушчы захапілі нас адразу, міла і пяшчотна сустрэла нас рака Лясная, і ўсе 15 дзён нам спрыялі і надвор'е, і людзі, і абставіны. Падчас вандроўкі мы наведалі і Брэсцкую крэпасць, і дзіцячы парк, і нават музей Аляксандра Суворава ў Кобрыне, праплылі па рацэ Піне на цеплаходзе.

І яшчэ ў тых мясцінах, дзе былі, мы пакідалі на добры ўспамін звесткі аб Слоніме і запрашэнне.

На Слонімшчыне ёсць дзіцячая арганізацыя "Ветразь надзеі", якая займаецца пошукавай, краязнаўчай, літаратурнай дзейнасцю. Выпускае сваю газету з аднайменнай назвай. Дэвіз арганізацыі: "Пазнай наваколле сваё, сваю спадчыну і перадай нашчадкам".

Шаноўныя сябры! Мы рады пазнаёміцца з вамі. Запрашаем вас у госці на Слонімшчыну. Прапануем маршруты:

— "Архітэктурная Слонімшчына" (культавыя і архітэктурныя помнікі XVI – XIX ст.);

— "Вядомыя Слонімцы" — (пісьменнікі, навукоўцы, краязнаўцы);

— Прыватны музей-кватэра Міхаіла Рылко "Беларускае мястэчка".

Вас прымуць у Слоніме праз суполку ТБМ імя Ф.Скарыны (Таварыства беларускай мовы) і грамадскае аб'яднанне "Воля да развіцця". Кантактныя тэлефоны ў Слоніме: 2-30-21, 4-22-14.

Хачу сказаць, што сёлета мы пайшлі ў вандроўку, дзякуючы Гродзенскай грамадскай арганізацыі "Ратуша" і дырэктару Слонімскай базы юных турыстаў Анатолю Юзвовічу.

Павел ЁРШ

У ЁЛКАЎСКАЙ ШКОЛЕ

Дзень беларускай пісьменнасці і друку (1 верасня) супадае з пачаткам навучальнага года і ў многіх школах з'яўляецца пачаткам шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных беларускаму прыгожаму пісьменству.

Менавіта ў гэты час настаўнікі, калі ёсць такая магчымасць, запрашаюць на сустрэчу з вучнямі паэтаў і пісьменнікаў. Вось і ў Ёлкаўскую школу, што ў Зэльвенскім раёне, шостага жніўня завітаў слонімскі паэт і наш калега журналіст Мікола Кананoвіч. Паслухаць госця сабраліся вучні сярэдніх і старэйшых класаў, а таксама многія настаўнікі. Больш як гадзіну ў школьнай зале гучалі вершы, вялася гутарка пра мову, літаратуру і гісторыю нашай краіны. А калі прыйшоў час развітвацца, вучні прасілі паэта пакінуць на памяць аб гэтай сустрэчы аўтограф **(на здымку)**.

Віталь ГІЛЬ,
фота аўтара

ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЕДЗЕ Ў ГЕРМАНІЮ

З 17 па 21 верасня ў памяшканні візавага аддзела Амбасады ФРГ у Мінску (па вуліцы Будзённага, 10) будзе праводзіцца рэканструкцыя. У гэты перыяд візавы аддзел для наведвальнікаў будзе зачынены. Пра гэта "ГС" паведаміла прэс-служба германскай Амбасады.

Будаўнічыя работы сталі непазбежнымі, каб справіцца са значнай колькасцю наведвальнікаў і гарантаваць усім своечасовую апрацоўку дакументаў. Візавы аддзел у Мінску з'яўляецца адным з трох буйнейшых візавых аддзелаў Германіі ў свеце (пасля Масквы і Кіева). У мінулым годзе Амбасадай ФРГ у Мінску было выдадзена каля 110 тысяч віз. А ў гэтым годзе вызначылася тэндэнцыя значнага росту паданых заявак — прыкладна на 25% больш, чым за мінулы год.

Валерый КАВАЛЕНКА

Інтэрв'ю

ПІСЬМО З ПАСОЛЬСТВА

У пасёлку Казлоўшчына, што ў Дзятлаўскім раёне, жыве цікавая жанчына — Алена Баярчук. Яна не тутэйшая, нарадзілася ў вёсцы Любча Навагрудскага раёна, але шмат гадоў таму назад пасля заканчэння Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута была накіравана ў Казлоўшчынскі атрад па ахове раслін. Тут выйшла замуж, нарадзіла і выгадавала двух сыноў, мае чацвёра ўнукаў.

У Алены Нікіфараўны два вялікія захапленні: яна вельмі любіць кветкі і дзяцей. Калі прыехала ў Казлоўшчыну, то прывезла з сабой насенне многіх кветак. Пасеяла не толькі на сваёй сядзібе, але і дала яго суседкам, новым знаёмым. І пачаў пасёлак цвісці з ранняй вясны да позняй восені.

— Алена Нікіфараўна, ну, кветкі — гэта зразумела: Вы закончылі факультэт аховы раслін. А адкуль такая вялікая любоў да дзяцей, не толькі да сваіх, але і да чужых, адкуль такая цяга зрабіць іх жыццё цікавым, змястоўным і неадынарным?

— На гэтае пытанне цяжка адказаць адназначна. Калі падрасталі мае сыны, да іх пастаянна прыходзілі сябры, і мяне гэта вельмі радавала. Заўсёды старалася пачаставаць чым-небудзь смачным. Яны елі, а я з замілаваннем глядзела на іх і ў думках прасіла ў Бога, каб паслаў усім здароўя і шчасця.

— Вы веруючы чалавек?

— Так. Калі жыла ў Любчы, то наша хата стаяла непадалёку ад царквы. Наша сям'я каталіцкага веравызнання, але царква была побач, і я часта хадзіла туды. Мяне, малую, вельмі захаплялі іконы, дзівосны роспіс сцен. Па царкоўных кнігах я навучылася чытаць яшчэ задоўга да таго, як пайшла ў школу.

— Я чула, што Вы арганізавалі ў Казлоўшчыне дзіцячы гурток і на працягу многіх гадоў працуеце па ўласнай ініцыятыве, без усялякага матэрыяльнага ўзнагароджання.

— Гэта сапраўды так. Калі падраслі ўнукі, у іх пачалі збірацца сябры. Я хацела, каб яны не трацілі марна час, а займаліся нечым карысным. Патэлефанавала ў Мінск сыну, і ён купіў для іх камп'ютэр, піяніна, шмат цікавых кніг па розных галінах ведаў. Усё гэта для дзяцей стала вельмі цікавым і іх пацягнула не да цыгарэт і спіртнога, а да музыкі, да работы з камп'ютэрам. Дарэчы, многія сябры маіх унукаў вучацца ў мясцовай музычнай школе і добра ўмеюць іграць на піяніна. Яны навучылі і тых, хто ў такую школу не ходзіць.

Каб у маёй хаце дзеткам было ўтульна, каб яны пастаянна адчувалі нябесную апеку, я паставіла ў пярэднім пакоі скульптуру Маці Божай. Яна сваім белым покрывам нібы ахінае кожнага, хто пераступіць парог хаты і надзяляе ласкай, дабрынёй, пяшчотай. Усім гэта вельмі падабаецца.

— Расказвалі, што Вашы выхаванцы ўдзельнічалі ў многіх конкурсах і сталі пераможцамі.

— Так. Аднойчы яны прачыталі ў газеце, што Беларускі нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францыска Скарыны, бібліятэка імя Адама Міцкевіча і рэдакцыя газеты "Раніца" праводзяць конкурс пад назвай "Ад храма да храма", і вырашылі прыняць у ім удзел.

— А што для гэтага трэба было?

Казлоўшчынскія дзеткі ў Мінску ў Чырвоным Касцёле ў час першай камуніі

— Ведаць гісторыю Беларусі, гісторыю стварэння храмаў, іх стыль, імёны архітэктараў, фундатараў. Гледзячы на той ці іншы здымак, адказаць, што за святыня на ім адлюстравана, дзе яна знаходзіцца. Акрамя таго трэба было напісаць у конкурсную камісію пра ўвесь род магнатаў Радзівілаў і іншых багатых людзей таго часу, якія давалі грошы на будаўніцтва храмаў. З усімі гэтымі заданнямі нашы дзеці справіліся паспяхова і занялі першае месца. Яны былі запрошаны ў Мінск у Чырвоны Касцёл для ўшанавання. Гэта было летась, калі ксяндза Уладзіслава Завальнюка прызналі Чалавекам года. Было так кранаюча і ўрачыста: дзеці ўшаноўвалі яго, а ён іх. Мае выхаванцы закончылі сваё выступленне словамі:

Знаёміць з гісторыяй, спадчынай — наша высnова.

І няхай ганарова гучыць на ўвесь свет наша родная мова.

Калі мы ехалі ў Мінск, то завезлі туды восем караваяў з зямлі Дзятлаўскай. Падарылі і рэдакцыі газеты "Раніца", і навукова-асветніцкаму цэнтру, і бібліятэцы, і ксяндзам.

Дарэчы, мае выхаванцы ўдзельнічалі і ў вельмі прэстыжным конкурсе "Польшча маімі вачыма", дзе таксама занялі першае месца.

— Патрабаванні былі жорсткія?

— Гэты конкурс праходзіў пры падтрымцы пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь, і дзецям была дадзена поўная свабода выбару: пішыце ўсё, што вы ведаеце пра Польшчу. І мы, без пахвальбы, зрабілі вельмі многае. Афармілі пяць вялізных альбомаў аб прыродзе, гарадах і вёсках краіны-суседкі. Запісалі на касеты польскія вершы, песні. У двух агульных сшытках расказалі пра гісторыю Польшчы, яе культуру, пісьменнікаў, мастакоў, наогул, славутых людзей.

І вось радасная навіна: у газеце "Раніца" дзеці прачыталі, што мы сталі пераможцамі і нам прысуджаны падарункі і грамата.

— Магу сабе ўявіць, як нялёгка далася вам перамога. На Беларусі ў вялікіх і малых гарадах ёсць столькі саюзаў палякаў, дзе нямала ўсякай літаратуры пра суседнюю краіну, у Гродне і Ваўкавыску працуюць польскія школы. А пераможцамі выйшлі дзеткі з Казлоўшчыны. Дзе ж вы ў сваім маленькім пасёлку, які мае звычайную бібліятэку, знайшлі столькі літаратуры пра Польшчу?

— У маёй асабістай бібліятэцы. Яна ў мяне багацейшая. І гэта дзякуючы сынам. Ды і сама я збірала і збіраю кнігі, што называецца, па крупіцах. А ўсё дзеля таго, каб мае выхаванцы былі высокаадукаванымі і прыстойнымі людзьмі. Мы з імі вывучаем не толькі беларускую, але і польскую, англійскую мовы.

— Узнагароды за перамогу яшчэ не атрымалі?

— А як жа, атрымалі. Класны кіраўнік 7 "А" класа Казлоўшчынскай СШ Кіра Аляксандраўна Блізнюк, чые выхаванцы з'яўляюцца і маімі, з'ездзіла ў Мінск, у польскае пасольства, і прывезла ўсё, што нам прызначалася. На ўрачыстай школьнай лінейцы дзеткі атрымалі тое, што яны заслужылі.

Скажу больш: мы атрымалі пісьмо з пасольства Рэспублікі Польшча за подпісам пасла Марыуша Машкевіча. Вось што ён піша: "Выказваю шчырую падзяку за ўдзел у конкурсе "Польшча маімі вачыма" і сардэчна віншую з прысуджэннем Вам узнагароды. Маю надзею, што яна з'явіцца добрай перадумовай для далейшага ўзбагачэння і паглыблення ведаў аб Польшчы і паляках, бо, напэўна, варта бліжэй пазнаёміцца з краінай, якая знаходзіцца побач.

Жадаю самых светлых дзён, шмат пяцёрак у школьным пасведчанні."

— Алена Нікіфараўна, кажуць, што Вы не толькі выхоўваеце дзетак, але і дапамагаеце матэрыяльна. Гэта праўда?

— Праўда. Але справа ў тым, што не столькі я дапамагаю, колькі мае сыны і сёстры. Дзеці атрымліваюць абутак, адзенне. Некаторыя людзі думаюць, што гэта дапамога касцёла. Хачу заўважыць, што ніякі касцёл да гэтага дачынення не мае. Проста — дабрачыннасць маіх родных. Яны, як і я, вельмі хочуць падарыць дзецям радасць.

Гутарыла Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Эсэ

ВЫБІРАЛІ, КАГО ЗНАЛІ

(Працяг. Пачатак на 1 стар.)

Закранулі ў гутарцы і кандыдатаў на прэзідэнцкі пост Домаша і Ганчарыка. На той час апазіцыя яшчэ не вызначылася з адзіным кандыдатам. Але з гэтых дваіх найбольш верагодных прэтэндэнтаў і мне, і Сцяпану больш імпаніраваў маладзейшы Домаш. Знаходзячыся ў адпачынку, бліжэй да прыроды і далёка ад камп'ютэра, інтэрнэту і працоўных будняў у газеце, я ў сваёй вёсцы валодаў не большай інфармацыяй, чым калгасны шафёр. А на беларускім тэлебачанні ўсё з большым і большым імпэтам раскручваліся "Тайныя спружыны палітыкі", дабаўляючы ачкі ў надзьмутую рознымі прапагандыстамі скарбонку дзеючага прэзідэнта. І хоць у гарачую жнівеньскую пару вяскоўцы не часта ўключаюць тэлевізар, але і той вячэрняй гадзіны эфіру на БТ для многіх было дастаткова, каб пераканаць сябе ў правільнасці палітыкі "бацькі". Тут, што называецца ў глыбінцы, з боку ад гарадской мітусні, як нідзе адчуваецца, наколькі ўсё яшчэ даверлівы ў нас народ. На пытанне, за каго будзеце галасаваць, мае землякі найчасцей адказвалі: "За Лукашэнку. За каго яшчэ?.. Больш няма за каго.". І ў гэтым "больш няма за каго" і была тая сярмяжная праўда, якая робіць і жыццё наша такім жа сярмяжным. Бо большасць вяскоўцаў амаль нічога не ведала пра іншых кандыдатаў. Для іх асноўныя крыніцы інфармацыі — тое ж тэлебачанне, "Советская Белоруссия" і "што начальнікі скажуць". І хоць не ўсе аднолькава "пераварваюць" прапагандысцкую хлусню "прыдворных" СМІ, але якраз вяскоўцы найбольш схільныя прымаць за чыстую манету надрукаванае і агучанае ў эфіры слова.

У суботу, 1 верасня, у вячэрнім эфіры Беларускага тэлебачання паказалі чарговую агітку на тэму, як добра жывецца ў Беларусі ў параўнанні з суседняй Расіяй. Маўляў, у нас і дамы будуюцца, і пенсіі выплочваюцца, і пра моладзь улада клапоціцца. А для нагляднасці тэлевізіёншчыкі ўзялі выбарачныя інтэрв'ю ў жыхароў памежнага з Беларуссю расійскага райцэнтра Суража. На пытанне, ці падабаецца вам дзеючы беларускі прэзідэнт, інтэрвіруемыя нязменна выказвалі сімпатыі Аляксандру Рыгоравічу, а расійскія бабулькі гатовыя былі за яго прагаласаваць.

Назаўтра ў нашым калгасе надарыўся выхадны дзень, і заўзятыя рыбаловы сустрэліся на возеры. Рыба бралася не вельмі, таму часу на размовы хапала. Калі дайшло да выбараў, мой сусед па рыбалцы Віктар, вопытны калгасны механізатар, сказаў, што галасаваць будзе за Лукашэнку. На пытанне, чаму менавіта за яго, Віктар спаслаўся на ўчарашнюю тэлеперадачу на БТ. Ні мізэрныя заробкі ў калгасе, ні затрымка іх выплаты, ні адсутнасць запчастак і перабоі з палівам ніяк не звязваліся ў разважаннях трактарыста з імем дзеючага прэзідэнта. Пасля прагляду бэтэшнай агіткі ён мысліў "глабальна": у нас лепш, чым у Расіі, і заслуга ў гэтым — Лукашэнкі...

Мой адпачынак, між тым, заканчваўся, пара было вяртацца на працу, да сумных рэаліяў жыцця.

Ішоў апошні перадвыбарчы тыдзень, а з чацвёртага верасня — датэрміновае галасаванне. Парушэнні выбарчага заканадаўства, якія пры гэтым зафіксавалі незалежныя наглядальнікі, — гэта асобная тэма. У рэдакцыю званілі і заходзілі людзі, якія расказвалі пра татальную агітацыю за "бацьку" мясцовых начальнікаў усіх узроўняў, пра вусныя дырэктывы кіраўнікоў прадпрыемстваў да сваіх работнікаў галасаваць датэрмінова і "як трэба". Што ж, ад улады нічога іншага чакаць не прыходзілася. А вось тэлефонны званок жанчыны з Дзеравянчыц прымусіў мяне задумацца. Жанчына пазваніла ў пятніцу, 7 верасня, і расказала, што па хатах ходзіць брыгадзір і рознымі праўдамі, няпраўдамі і несусветнымі пагрозамі прымушае людзей ісці галасаваць датэрмінова, і многія ўжо прагаласавалі. Вясковую жыхарку абразіў гэты факт, а мяне здзівіла яе пытанне, ці мае брыгадзір права на падобныя дзеянні? Ёй бы такога "агітатара" чапялой з хаты гнаць, а яна, бач, сумняваецца ў неправамоцнасці яго дзеянняў. Вось і думай пасля гэтага, у чым схавана "рахманасць" беларуса: у няведанні, у страху, ці ў тым і другім разам узятым?

У дзень выбараў, 9 верасня, дзяржаўная машына дзеючага прэзідэнта працавала як ніколі зладжана: ніякіх істотных парушэнняў пры галасаванні, небывалая актыўнасць выбаршчыкаў, карэктнасць і дабразычлівасць членаў выбарчых камісій, што адзначалі як незалежныя наглядальнікі, так і журналісты. Праўда, журналісты "Газеты Слонімскай" у гэты дзень паспыталі нязручнасці ў працы — зранку ў рэдакцыі замоўклі ўсе тэлефоны і перастала працаваць электронная сувязь. Хоць гэтая дробнапакасная "дыверсія" з адключэннем рэдакцыі ад сродкаў сувязі была ўжо зусім лішняй. Народ на выбары прыйшоў, і кожны прагаласаваў за таго, каго ведаў. Чаго ўжо ўладзе баяцца незалежных СМІ? У працэнтных адносінах (да дзяржаўных газет, радыё і тэлебачання) яны складаюць меншую частку, чым нават тая колькасць людзей на гэтых выбарах, якая прагаласавала за альтэрнатыўных Лукашэнку кандыдатаў. Ды размова зараз не пра тое. Мы выбіралі. Выбіралі, каго знал, і выбралі. Можна сказаць, што ўлада ўсімі сродкамі, як магла, дапамагла народу выбраць, каго ёй трэба. Тым не менш, кожны народ заслугоўвае свайго правіцеля. І, як на мой погляд, добра ўжо тое, што гэтыя выбары адбыліся і паказалі, што мы яшчэ доўга будзем вучыцца выбіраць.

Мікола КАНАНОВІЧ

Газета Слонімская
13 — 19 верасня 2001г. №37 (223)

ЧЕМПИОНАТ МИРА - 2002

ЭДУАРД МАЛОФЕЕВ: "СПАСИБО СБОРНОЙ ПОЛЬШИ ЗА ДОСТАВЛЕННОЕ УДОВОЛЬСТВИЕ"

Герой матча Роман Василюк (слева)

5 сентября в Минске сборная Беларуси вернула себе и своим болельщикам надежду на участие в чемпионате мира по футболу. В юбилейном для себя, 60-м матче против поляков наша сборная одержала убедительную победу 4:1.

Причем, впервые в истории белорусского футбола один футболист в официальном матче национальной сборной забил четыре мяча. Роман Василюк, безусловно, стал героем матча. Больше – народным героем. Чтобы забить свои четыре гола ему потребовалось всего 5 ударов. В ответ же белорусы получили единственный гол от Марцина Жевлакова под занавес игры.

Свои мнения об исходе матча тренеры команд высказали на послематчевой конференции.

Ежи Энгель:

– Хочу поздравить сборную Беларуси с победой, которая дает ей шанс претендовать на второе место в группе. Сегодня мы сыграли в "веселый" футбол. Не было должной концентрации в обороне. После победы над Норвегией и завоевания путевки в финальную часть чемпионата мира эйфория охватила нашу команду, и мне не удалось психологически подготовить ее к серьезному поединку.

К следующему поединку мы будем готовиться в совершенно других условиях. 6 октября на стадионе соберется более 45 тысяч болельщиков. Неужели вы думаете, что в такой обстановке команда сможет сыграть плохо?

Эдуард Малофеев:

– К сожалению, сборная Беларуси к намеченной цели идет через пень-колоду: проиграли Украине, зато сегодня выиграли. Безусловно, мы очень рады, хоть вздохнули свободно. Потому что, когда не выполняешь задачу — грош тебе цена.

Если бы в предыдущем матче сыграли так же азартно и коллективно! Тут ведь вот какая штука. Когда играешь коллективно – тогда и приходит успех. А эгоизм делает человека и команду маленькими. Я ведь не говорю, что Хацкевич с Белькевичем плохие футболисты. Кайтесь и приходите. Кайтесь, и играйте хорошо. А по-другому нельзя...

На сегодняшний день в 5-ой отборочной группе вслед за лидером сборной Польши (20 очков) идут сборные Украины (16 очков) и Беларуси (15 очков). В последнем раунде (6 октября) и выяснится судьба второй путевки на чемпионат мира. В этот день встретятся Армения с Норвегией, Польша с Украиной и Уэльс с Беларусью. Ждать осталось чуть меньше четырех недель.

Валерий КОВАЛЕНКО

КАЎБАСКІ ПА-МАГІЛЁЎСКУ ПАДВЯЛІ

8 верасня не адбылася чарговая сустрэча паміж мастоўскім "Нёманам" і гомельскім ЗЛіНам. Прычынаю таго стала няякаснае харчаванне спартсменаў у сталоўцы ААТ "Мастоўдрэў".

Каманда паехала ў Гомель, і там чацвёра футбалістаў былі змешчаны ў Гомельскую абласную інфекцыйную бальніцу з дыягназам "вострае атручванне". У гэту чацвёрку трапілі асноўныя ігракі каманды Аляксандр Вярбіцкі, Пётр Жукоўскі і Уладзімір Кухлей. Іншым футбалістам у бальніцы проста не хапіла месца.

Што будзе надалей: залічаць мастаўчанам паражэнне, або матч будзе перанесены – вырашыць федэрацыя футбола РБ. Гэта не апошнія ахвяры харчовага атручвання. Яшчэ амаль два дзесятка выхаванцаў мясцовай юначай спартыўнай школы ў гэты дзень апынуліся ў інфекцыйным аддзяленні Мастоўскага ТМА. Зараз сталовая і буфет ААТ "Мастоўдрэў" зачынены да высвятлення абставін.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ГРЭБЛЯ

З МАСКВЫ З УЗНАГАРОДАМІ

Слонімскія прызёры Маскоўскай рэгаты

Напрыканцы жніўня — пачатку верасня веславальшчыкі Слонімскай СДЮШАР №2 прымалі ўдзел у міжнародных спаборніцтвах краін СНД у Маскве.

З сямі нашых хлопцаў чацвёра вярнуліся з той рэгаты з узнагародамі. Максім Анішчык (СШ №2) і Аляксей Лойка (СШ №5) у байдарцы-двойцы на дыстанцыі 1000м сталі бронзавымі прызёрамі. Віталь Пракоф'еў (СШ №3) на шасцікіламетроўцы ў каноэ-адзіночцы быў другім і крыху горшыя вынікі паказаў на 500 м (чацверты) і 1000 м (пяты).

Лепш за ўсіх выступіў Дзмітрый Лойка (СШ №5). На байдарцы-адзіночцы яму не было роўных у марафоне на 12 кіламетраў. Яшчэ ў чатырох разнастайных заездах ён стабільна ўваходзіў у дзесятку: чацверты на 1000м у адзіночцы, шосты на 500-сотцы, дзесяты на 1000-мятроўцы ў двойцы і чацверты ў эстафеце 4Х200 м.

Крыху горшыя вынікі паказалі Дзмітрый Каваленка (СШ №5), Канстанцін Кароль (гімназія №1) і Валерый Дубовік (СШ №8). Але і яны не пасаромілі сваіх трэнераў, заняўшы месцы з шостага па дзевятае ў сваіх заездах.

Наступныя вялікія старты для юных майстроў вясла ў Слоніме павінны адбыцца ў кастрычніку, калі пройдзе чарговы турнір на прыз Алімпійскага чэмпіёна Уладзіміра Раманоўскага. Да таго ж, Слонімская СДЮШАР №2 плануе сумясціць гэтыя спаборніцтвы са сваім 30-гадовым юбілеем.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПЕРШАЯ ЛІГА

БЕЗ АДЗІНАГА ГАЛА, АЛЕ СА ЗДАБЫТЫМ АЧКОМ

"Ліда" — "Камунальнік" (Слонім), 0 – 0

8 верасня. Ліда. 1500 гледачоў.

Суддзя: Ю.Кунцэвіч (Гродна).

Камунальнік: Бекіш, Капельян, Кірыленка, В.Дзегіль, Місюк (Верэшня), А.Дзегіль, Вярбіцкі, Цішчанка (Шэпятоўскі), Горбач (Чэпкі), Грынюк, Аначэнка.

... А вось так у першай гульні слонімцы "раскідалі" лідчан з лікам 4:0

На думку галоўнага трэнера слонімцаў, "Камунальнік" у гэтым матчы паказаў добрую гульню. Спрыяла гэтаму і выдатнае поле ў Лідзе. Магчыма, вынік гульні мог быць і іншым, але не здолелі згуляць у "аснове" траўміраваныя Астапчык і Варанцоў.

Увогуле ж, гульня глядзелася. Слонімскія футбалісты даволі настойліва шукалі шчасця каля варотаў гаспадароў. Адзін толькі Дзмітрый Аначэнка тройчы павінен быў забіваць, але вызначыцца не здолеў. Прычым двойчы – выходзячы сам на сам з варатаром лідчан.

Дарэчы, "Ліда" вельмі неахвотна страчвае ачкі на сваім полі. Нават лідэры чэмпіянату "Хімік" і "Зорка-ВА-БДУ" прайгралі ў гасцях у лідчан. Што ж казаць пра "Камунальнік", якому на сезон пастаўлена задача застацца ў першай лізе і пабудаваць новую каманду? Відаць нешта, – няхай сабе пакуль эпізадычна, – у слонімцаў атрымліваецца. Бо па галявых момантах, як адзначыў Леанід Савіцкі, "Камунальнік" быў наперадзе 6:3.

Тым не менш, скончыўся матч нулявой нычыёй, мала змяніўшы турнірнае становішча каманд. Быў і яшчэ адзін вынік матчу. Дваіх слонімцаў, Горбача і Цішчанку, панеслі з поля на насілках, бо гульня ў другім тайме з боку гаспадароў стала вельмі ж ужо грубай і бруднай.

А наступная гульня чакае "Камунальнік" на выездзе ў Салігорску супраць мясцовага "Хіміка". Выйграць там для слонімскіх футбалістаў малаверагодна, бо гаспадары прэтэндуюць на выхад у вышэйшую лігу. Ды й гульня будзе праходзіць у Салігорску ў "Дзень горада".

Валерый КАВАЛЕНКА

ТУРНІРНАЯ ТАБЛІЦА ПАСЛЯ 22-га ТУРА

		гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1.	Тарпеда	19	15	2	2	47	37-9
2.	Зорка-ВА-БДУ	20	13	4	3	43	49-17
3.	Хімік	20	13	4	3	43	42-16
4.	Дарыда	19	12	4	3	40	32-14
5.	Граніт	19	9	3	7	30	34-18
6.	Тарпеда-Кадзіна	20	9	3	8	30	18-21
7.	Ліда	20	8	6	6	30	24-20
8.	Орша	20	8	1	11	25	29-44
9.	Керамік	20	7	4	9	25	25-29
10.	Свіслач	20	6	4	10	22	25-39
11.	Камунальнік	19	5	4	10	19	19-27
12.	ЗЛіН	20	4	7	9	19	23-28
13.	Дынама-Юні	21	4	5	12	17	16-32
14.	Рагачоў-ДЮСШ-1	20	2	7	11	13	19-50
15.	Нёман	19	2	4	13	10	13-41

РАЗЫСКИВАЕТСЯ

Слонимским ГРОВД разыскивается без вести пропавший Столярчук Александр Павлович, 1966 г.р., уроженец г. Слонима, проживавший: г. Слоним, ул. В. Крайнего, 27-37, который 11.08.2001г. около 17 часов ушёл из дома и до настоящего времени его местонахождение неизвестно.

Пропавший без вести страдает психическим заболеванием.

ЕГО ПРИМЕТЫ: на вид 35 лет, рост 178 см, телосложение среднее, лицо овальное, волос прямой, средней длины, тёмно-русого цвета, глаза карие, нос прямой, возможно небрит.

ОСОБЫЕ ПРИМЕТЫ: шрам на шее с левой стороны длиной 2,5 см, шрам на животе от аппендицита, родинка возле правого уха.

БЫЛ ОДЕТ: тенниска с коротким рукавом, бежевая в чёрную полоску, с накладными карманами на груди, брюки джинсовые тёмно-синего цвета, босоножки коричневого цвета.

Просим всех, кому что-либо известно о местонахождении Столярчука А.П., а так же лиц, схожих с ним по приметам и имеющих явные признаки психического заболевания, сообщить в Слонимский ГРОВД по телефонам: 2-39-02, 2-18-02 или 02.

анекдоты

Мужик приходит на прием к психиатру.

- По бумагам я знаю, кто вы, - говорит врач. - Но я хочу, чтобы вы совершенно откровенно рассказали мне о своей жизни с самого начала.

Мужик откашлялся и начал:

- Так вот, сначала я создал Небо и Землю...

В одну воздушно-десантную дивизию намечается приезд комиссии. Все в панике: никто не прыгал с парашютом. Один солдат говорит:

- Давайте привяжем к парашютам мешки и сбросим их в кусты. А мы там спрячемся и выскочим.

Решили так и сделать. Приезжает комиссия. Расположились на наблюдательном пункте. Прилетели самолеты, сбросили мешки. Вдруг один мешок оторвался и плюхнулся со страшной силой в кусты. Оттуда выбегает солдат:

- Черт, так и убиться можно!

Мужик приходит домой пьяный в доску, открывает дверь и с порога орет:

- Эй, я пришел! Слышь? Я что сказал, я пришел! Я чё, не ясно сказал?

Никто не отвечает. Мужик идет на кухню, открывает шкафчик, роняет на пол тарелки, которые, естественно, разбиваются, и орет:

- Я пришел, говорю! Эй, ты!!!

В ответ опять молчание. Мужик идет в комнату, роняет на пол вазу, опрокидывает стол вместе с телевизором и сваливает на пол все, что только можно.

Наконец, он прямо в ботинках падает на кровать и говорит:

- Эх, как это классно - жить одному!

Говорят, что кушать перед зеркалом нельзя - счастье своё проешь...

И пить тоже - пропьёшь.

А ставить зеркало в туалете вообще не рекомендуется...

- Официант, можно еще немного пожарить этих перепелов?

- Разве они плохо прожарены?

- Я не знаю, но они у меня салат жрут.

На пустыре бандитская стрелка - все заставлено джипами. К ним подруливает милицейская машина, из которой выходит милиционер.

- Так, что здесь происходит?!

В ответ стоящий рядом бандюга сует ему 100 баксов и говорит:

- А теперь вали отсюда!

Милиционер возвращается в машину и приговаривает:

- Все секреты, секреты...

Новости из колхоза:

Слесарь Сидоров Петр Иваныч по пьяни перепутал в автодоилках плюс и минус и закачал в несчастных коров все вчерашнее молоко.

Новый русский говорит кентам:

- Прикиньте, сегодня свой мерс на профилактику загнал на СТО. Ну и когда забирал, думаю, что если опять ни за что бабки снимут, взорву их к чёрту!

- Ну и что?

- Повезло им! Всего-то 12 баксов за замену жидкости в поворотниках сняли....!

«Пляж — райскі адпачынак»



Пяскі Берасцейшчыны — чым не райскі куточак для адпачынку?

кроссворд

Составила Надежда ПУГАЕВА



Вправо — вниз:

1. Мера длины.
3. Кухонный предмет для просеивания муки.
5. Сельский староста при панской Польше.
12. Автомат, который исполняет различные действия, похожие на действие человека.
14. Очертание контура.
16. Семейство птиц отряда головастых.
18. Член высшей палаты английского парламента.
19. Время, в течение которого работает человек.
26. Южное плодовое цитрусовое дерево.
28. Нанесение удара носом корабля.
30. Мастер по производству оптических приборов.
32. Отходы от сжигания дров, угля.
33. Скопление пузырей на воде.
39. Чувство, органом которого служит язык.
41. Крепкая ткань в мелкие рубчики.
43. Природная желтая краска.

Влево — вниз:

2. Вторая буква греческого алфавита.
4. Пенящийся напиток.
6. Пищевой кристаллообразный продукт.
11. Музыкальный звук.
13. Большая церковь в городе.
15. Многолетняя злаковая пищевая культура.
17. Рельефный рисунок, сделанный на металлической или деревянной пластинке.
20. Условный язык какой-либо профессиональной группы.
25. Оливковое масло, употребляемое в церкви.
27. Жалящее насекомое.
29. Отходы молока в сыродельном производстве.
31. Гладкая площадка, покрытая льдом.
34. Чертёж какой-либо местности.
40. Радиактивный химический элемент.
42. Детская болезнь.
44. Химический элемент.

Вокруг цифр

по ходу часовой стрелки:

7. Установка для ускорения электронов.
8. Гробница.
9. На Руси придворный, ниже боярина.
10. Высокая подставка для гроба.
21. Драгоценное украшение.
22. Деревья, кустарник, от корня которых вырастают стебли.
23. Автоматический регулировщик дорожно-транспортного движения.
24. Шкурка, сброшенная во время линьки.
35. Нападающая сторона.
36. Лицо, которое оформляет юридические документы.
37. Статья, посвящённая умершему.
38. Оконечная часть текста.

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ

от www.ignio.com

ОВЕН

Вас по-прежнему не покидает отменное расположение духа, которое Вы стремитесь передать окружающим людям. В отношениях с коллегами стоит осознать, что истина посещает не только Вас, и тогда трудовые успехи гарантированы. Во вторник может поступить интересная информация, которая заинтересует Вас. В среду постарайтесь следить за своей речью при общении с коллегами, т.к. Ваше упрямство и чрезмерная принципиальность может привести к конфликтной ситуации. В четверг к Вашим идеям прислушается начальство, появятся взаимовыгодные конструктивные предложения. Выходные проведите так, чтобы восстановить свой энергетический потенциал.

ТЕЛЕЦ

Вы живете ощущением значительности перемен, однако не стремитесь расставить все по своим местам, т.к. ситуация стабилизируется не сразу. Движение вокруг Вас свидетельствует о вступлении в полосу новой жизни. Проявите дружеские чувства к окружающим, и к Вам придет так необходимая Вам поддержка. В среду важно отделить главное от второстепенного, иначе суета сможет поглотить Вас, а результаты не соответствовать ожиданию. В пятницу вероятен конструктивный разговор с начальством, позволяющий Вам обрести новые полномочия.

БЛИЗНЕЦЫ

Дела складываются хорошо, если Вы не будете принимать близко к сердцу проблемы, связанные с необходимостью освобождения от прежних обязательств. Прислушайтесь внимательно к собственным ощущениям, и они подскажут, что Вам делать. В понедельник и вторник Вы сможете многое завершить. Среда удачна для поездок и путешествий. В четверг возможна ситуация, когда Вам придется защищать свои идеи и замыслы. Пятница больше располагает к отдыху на природе, чем к работе. В субботу возможны интересные события, которые изменят Вашу жизнь в лучшую сторону.

РАК

Предстоящая неделя благоприятна для начала новых дел. Будьте внимательны, судьба пошлет Вам предзнаменование в виде небольших и не всегда заметных знаков, почувствуйте их, считайте, что госпожа фортуна улыбается Вам. Вторник, среда и четверг весьма хороши для заключения финансовых договоров, сделок, достижения компромисса по всем денежным вопросам. В пятницу многое будет зависеть от Вас, желательно посвятить часть времени планированию на ближайшее будущее.

ЛЕВ

Вы недовольны собой и сложившейся ситуацией, постарайтесь найти положительные моменты и сохраняйте душевное равновесие, иначе это может способствовать ряду недоразумений и конфликтов. Это следствие Ваших попыток выйти на новый уровень жизни, к чему Вы медленно и верно идете. Тем не менее, в понедельник и среду желательно не обременять окружающих своими заботами. Не задавайте слишком много вопросов - чем больше их окажется, тем сильнее будет разочарование.

ДЕВА

Эта неделя обещает быть на редкость плодотворной и щедрой на приятные сюрпризы. Вам будет приятно внимание окружающих, Вы это заслужили. В понедельник Вам необходимо отстоять свои замечательные идеи. В среду будьте внимательны к тому, что Вы говорите или собираетесь произнести. Желание все сделать по-своему придет к Вам в четверг, и у Вас это блестяще получится. В четверг смело обращайтесь за помощью к близким людям, и они с радостью и желанием откликнутся на просьбу.

ВЕСЫ

Если Вы хотите достичь успеха, то Вам необходимо определиться с принципами и четко для себя выяснить, что Вы хотите и на каких условиях. Первые два дня пройдут под знаком размышлений, неуверенности и даже тревоги. Постарайтесь не зацикливаться на мелочах и не стесняйтесь обращаться за помощью. Это особенно может быть характерно для понедельника. Во вторник желательно не тянуть одеяло и не принимать окончательных решений. В среду желательно не рисковать и не совершать опрометчивых поступков.

СКОРПИОН

Предстоящая неделя обещает быть полегче предыдущей, но тревог и волнений все равно не избежать. Если Вы захотите оградить себя от нежелательных поступков, побольше говорите о них в понедельник, результаты могут оказаться совсем не такими, как Вы ожидали. Во вторник будут удачными поездки и командировки. В среду желательно быть осторожнее при общении с коллегами и близкими людьми, т.к. упрямством Вы вряд ли достигнете желаемых результатов. В четверг возможно интересное предложение со стороны начальства.

СТРЕЛЕЦ

Вы стоите на пороге перемен, но для того, чтобы они произошли, придется преодолеть ряд негативных моментов, которые проявятся на этой неделе. В понедельник, почувствовав вкус к новизне, Вы решите для себя что-то важное, однако не спешите объявлять об этом, т.к. во вторник ситуация достаточно резко изменится и Вы можете оказаться в весьма щекотливом положении. В среду ситуация изменится к лучшему, вероятно поступление важной и своевременной информации, которая откроет для Вас новые перспективы. В выходные займитесь домашними делами, чтобы отогнать вредные мысли.

КОЗЕРОГ

На этой неделе Вам будет необходимо разобраться с накопившимися делами и устранить недоделки. Вы стремитесь к чему-то, что еще не можете толком объяснить, и это нечто создает в Вашей жизни определенные проблемы. Во вторник желательно не предпринимать ничего нового, будьте во всем осторожны и внимательны. В среду будет удачным погружение в мелкие проблемы. В четверг не помешает осторожность в общении с коллегами, помните, что в данной ситуации молчание - золото. В субботу Вас могут озарить новые интересные идеи и замыслы.

ВОДОЛЕЙ

Неделя обещает быть удачной, но при условии, что Вы перестанете витать в облаках и начнете сочетать подсказки интуиции с реальными возможностями. В понедельник рассчитывайте на помощь друзей, но постарайтесь не ввязываться в ссоры, которые могут омрачить Ваше безоблачное настроение. Во вторник желательно не рассказывать о себе, иначе это послужит поводом для кривотолков и сплетен. В среду лучше держаться подальше от слишком соблазнительных и заманчивых проектов, не все то золото, что блестит.

РЫБЫ

Неделя может быть сложной и противоречивой, навалится много разнообразных дел, и Вы не будете знать, за какое из них браться в первую очередь. В понедельник возможно появление покровителя или нового начальника, который будет к Вам благосклонен. Может начаться новый отсчет в Вашей карьере. Во вторник бесконечные, хоть и удачные поездки и улаживания служебных проблем могут вытянуть из Вас энергию. В четверг возможно внезапное улучшение материального благополучия.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК
ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
..........(017)210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку 12 верасня 2001г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
НАКЛАД 11.400 экз.
ЗАКАЗ № 2870

Аб'ём — тры друкаваныя аркушы

E-MAIL: gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by ПЭЙДЖЭР: 8-22-730000 аб. 95196